**ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2018 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

**1 снежня**

У бібліятэцы прайшла гадзіна цікавых паведамленняў «Спяшайцеся жыць, а не расставацца з жыццём!», удзельнікамі якога сталі старшакласнікі мясцовай школы. Бібліятэкар расказала падлеткам аб смяротным вірусе, яго прыкметах, як ВІЧ пераходзіць у стадыю СНІД, шляхах перадачы і прафілактыцы. Вядучая мерапрыемства прадставіла артыкулы па тэме, сабраныя ў тэматычныя папкі-дасье, агучыла статыстыку і дынаміку захворвання СНІДам у Кобрынскім раёне, акрэсліла магчымасць прайсці бясплатнае ананімнае тэставанне на ВІЧ, уручыла буклеты "ВІЧ і СНІД: простыя правілы бяспекі».

Гарадзецкі філіял, 35 чал.

**3 снежня**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу арганізавала выступленне літаратурна-паэтычнай групы «ВИЧ - знать, чтобы жить!». У мерапрыемстве ўдзельнічалі ўрач-валеолаг цэнтра «Арыенцір» г. Кобрына Філіпеня Вольга Рыгораўна і ўчастковыя інспектары інспекцыі па справах непаўналетніх Багаслаў А. З. і Марчук А. Ф. Бібліятэкар падрыхтавала кніжную выставу «Мы говорим здоровью ДА!» і тэматычную мультымедыйную прэзентацыю.

Хідрынская ПБ, 54 чал.

**3 снежня**

У час правядзення пасяджэння клубу «Час і ты» - урока-роздуму «СПИД: знать, чтобы бороться» навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання пазнаёміліся з гісторыяй захворвання, з Міжнародным сімвалам барацьбы са СНІДам - Чырвонай стужкай. Урач-валеолаг цэнтра «Арыенцір» Філіпеня В.Г. расказала пра спосабы перадачы віруса і правілах прафілактыцы, пазнаёміла са статыстыкай захворванняў СНІДам у Кобрыне і Кобрынскім раёне. Увазе прысутных прадстаўлена прэзентацыя «Погасшие звезды».

ЦБ, 32 чал.

## Мерапрыемствы да Навагодніх свят

**28 снежня**

У час правядзення гадзіны творчасці «Мы сустракаем Новы год» дзеці пазналі, як зрабіць арыгінальныя ўпрыгожванні на ёлку сваімі рукамі, паўдзельнічалі ў майстар-класе па выразанні сняжынак, навагодніх

трафарэтаў на вокны, расказалі пра свае сямейныя традыцыі на навагоднія святы і ўспомнілі зімовыя казкі.

Лукская ПБ, 28 чал.

**28 снежня**

Бібліятэкар арганізавала выступленне лялечнага гуртка «Буратино» «Морозко». Дзеці прагледзелі спектакль, прынялі ўдзел у вясёлай казачнай віктарыне і гульні на ўважлівасць, прысвечанай Дзеду Марозу, навагоднім і калядным святам. Напрыканцы мерапрыемства ўсе жадаючыя напісалі ліст Дзеду Марозу.

Павіццеўская ПБ, 26 чал.

**28 снежня**

Гасцямі навагодняга падарожжа «В дверь стучится Новый Год» сталі падапечныя Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання дзённага знаходжання дзяцей-інвалідаў. Вядучыя пазнаёмілі ўдзельнікаў мерапрыемства з гісторыяй Новага Года, навагодняй елкі. Расказалі пра галоўныя персанажы навагодніх святаў - Дзеда Мароза і яго ўнучцы Снягурачцы. Завяршылася мерапрыемства праглядам фрагмента навагодняга мультфільма «Новогодняя ночь».

ЦБ, 18 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**2 снежня**

Гасцямі вечара бардаўскай песні «Наполним музыкой сердца» сталі ўдзельнікі «Універсітэта залатога ўзросту» і жыхары горада. Відэапрэзентацыя «Музыка волн, музыка ветра…» пазнаёміла прысутных з гісторыяй развіцця гэтага песеннага жанру, са знакамітымі кампазітарамі-бардамі. Увазе слухачоў былі прадстаўлены знакамітыя бардаўскія песні на словы рускіх паэтаў Ю. Візбара, У. Высоцкага, Б. Акуджавы. Перад прыхільнікамі аўтарскай і бардаўскай песні выступілі аматары бардаўскага руху Кобрыншчыны: Ю. Харэвіч, У. Лукашук, Н. Крывагуз, В. Бордзюг.

*Симонова, И. «Наполним музыкой сердца…» / И. Симонова // Кобрин-информ. – 2018. – 20 декабря. - с. 4.*

ЦБ, 67 чал.

**4 снежня**

Да Міжнароднага дня інвалідаў для падапечных Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання дзённага знаходжання дзяцей - інвалідаў праведзены літаратурна-музычная кампазіцыя «Давайте делать добрые дела!». Вакальны гурт бібліятэкі і ўдзельнікі клуба «Встреча» пад кіраўніцтвам Жуковіч В.А. стварылі атмасферу мерапрыемства радаснай і святочнай, з песнямі, віктарынай, загадкамі.

*Душевная встреча друзей // Кобрынскі веснік. – 2018. – 19 снежня. - с. 6.*

ЦБ, 34 чал.

**10 снежня**

Дзень прававой асветы «Имею право, но обязан» падрыхтаваны ў рамках Дня правоў чалавека і прысвечана 70-й гадавіне прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. навучэнцы політэхнічнага каледжа г. Кобрына - прынялі актыўны ўдзел у віктарыне, гульнях, а таксама пазнаёміліся з даведачна-прававой сістэмай «ЭТАЛОН-WIN». Прысутныя мелі магчымасць атрымаць кансультацыі прадстаўнікоў юрыдычных арганізацый Кобрына: памочніка пракурора раёна М. Н. Свістуновіч, заг. юрыдычнай кансультацыі Е. В. Мінгазавай, заг. натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна І. П. Марчук.

*Пальто, К. Важно знать свои права / К. Пальто // Кобрынскі веснік. – 2018. - № 97. - с. 6.*

ЦБ, 52 чал.

**21 снежня**

Семінар-практыкум «Публичная библиотека: традиции, новации, перспективы», прысвечаны Новаму году, сабраў у сценах інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра працаўнікоў публічных бібліятэк раёна. Метадысты прадэманстравалі прысутным электронную прэзентацыю па цікавых ідэях афармлення бібліятэк раёна. З добрымі словамі і пажаданнем новых творчых поспехаў звярнулася да калег дырэктар ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». Свае музычныя выступленні падарыла прысутным вакальная група цэнтральнай бібліятэкі. Апошнім акордам стала ўручэнне навагодніх падарункаў старшынёй прафсаюза.

ЦБ, 56 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81